http://edoc.bseu.by

# ЦІ МЕЎ ФРАНЦІШАК СКАРЫНА ЮРЫДЫЧНУЮ АДУКАЦЫЮ: ПАСТАНОЎКА ПРАБЛЕМЫ

В. А. Саўчык

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

2022 год быў юбілейным для беларусаў, паколькі 500 год таму на землях Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) была надрукавана першая кніга. Гэта адбылося дзякуючы Францыску Скарыне. Ураджэнец старажытнага Полацка, выбітны філосаф, асветнік, гуманіст, пісьменнік, бліскучы навуковец эпохі Адраджэння, Скарына ўвайшоў у гісторыю як «бацька» ўсходнееўрапейскага кнігавыдання, а таксама як доктар права. Ён прымаў удзел у стварэнні Статута ВКЛ 1529 г., бо на той час працаваў у біскупа Яна, сына і сакратара караля Жыгімонта I Старога, у якасці сакратара. Гэты яго статус падцвярджаецца дакументальна, а вось аб ступені доктара права, наадварот, падцверджання няма. Таму ўзнікае лагічнае пытанне: быў Францішак Скарына прафесійным юрыстам або проста чалавекам з добрай еўрапейскай адукацыяй.

Мэта працы: па гістарычных крыніцах і даследчыцкай літаратуры высветліць, ці меў Ф.Скарына юрыдычную адукацыю.

Францыск (Георгій) Скарына нарадзіўся каля 1490 г. у Полацку. У 1504 г. ён паступіў у Кракаўскі ўніверсітэт і скончыў яго са званнем «бакалаўра свабодных навук». У 1512 г. у Падуі Скарына здае экзамен па медыцыне і становіцца «доктарам лекарскіх навук». У 1517 г. у Празе ён выдае ў перакладзе на старабеларускую мову 22 кнігі Бібліі і Псалтыр, а затым, ужо ў Вільні, у 1522 г. – «Малую падарожную кніжыцу» і «Апостал». Для кожнай кнігі Ф. Скарына пісаў прадмову, а часам пасляслоўе, у якіх выказваў свае погляды, ў тым ліку на прыроду права, дзяржавы і ўлады.

Дзяржава Скарынам вызначаецца як «отчина своя», «посполитое доброе», «собрание людское», самай галоўнай мэтай якога з’яўляецца дасягненне ўсеагульнай карысці і як мага лепшага жыцця. Яго палітычны ідэал – асветная, гуманная і моцная манархія. Прыкладамі лепшых кіраўнікоў асветнік лічыў Саламона, Пталамея, Салона, Лікурга і іншых старажытных мысляроў і заканадаўцаў. На яго думку, манарх павінен быць набожным, мудрым, адукаваным, чулым і справядлівым [2,с.41]. Скарына разумеў, што рэлігія з’яўляецца магутным рэгулятарам грамадскага жыцця. Аднак ва ўмовах фарміравання новых грамадскіх адносін яна відавочна ўжо не магла спраўляцца з роляй безумоўнага сацыяльнага рэгулятара, якім яна з’ўлялася ў Сярэднявеччы. Новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы патрабавалі новых механізмаў кіравання грамадствам. На думку Ф. Скарыны, такім механізмам павінна быць права. Як адзначае С. Алексютовіч, Скарына стаяў ля вытокаў так званага буржуазна-прававога светапогляду [1]. Да закона ён вылучаў пэўныя патрабаванні, сцвярджаючы, што закон павінен адпавядаць «звычаям зямлі, часу

і месца», – ставіцца да прасторы і часу, быць магчымым для выканання і карысным для насельніцтва так, як кожны народ адчувае ўздзеянне геаграфічнага размяшчэння.

Скарына з'яўляецца па сутнасці першым мысляром Беларусі, які падняў пытанне аб суадносінах права і закона, хоць пад паняццем права ў яго выступала сістэма раннехрысціянскіх маральных нормаў, якія ўтвараюць яго ідэал – «прирожоное право». Менавіта на аснове гэтых норм, на яго думку, павінна будавацца сістэма нормаў пісанага права. Пісанае права Скарына падзяліў на боскае, царкоўнае і земскае. Боскае і царкоўнае права ён ставіў на другое месца пасля прыроднага (натуральнага).

У сваю чаргу земскае права ён падзяляў у залежнасці ад грамадскіх адносін на: паспалітае, язычаскае (міжнароднае), царскае (дзяржаўнае), рыцарскае (ваеннае), мескае (гарадское), марское, купецкае (гандлёвае). Размежаванне рымскага права з боскім і царкоўным мела глыбокі тэарэтычны і практычны сэнс, таму што не прызнавала дамаганні каталіцкага духавенства на кіраўніцтва законатворчасцю і судовай практыкай [4, с.61-64].

Аналіз менавіта гэтых прававых ідэй, выказаных Ф. Скарынам, дазволіў Язэпу Аляксандравічу Юхо зрабіць выснову, што ён паклаў пачатак развіццю прававой навукі ў Беларусі, прычым не толькі яе тэарэтычных праблем, але і практыкі. Язэп Юхо наўпрост называе Францішка Скарыну заснавальнікам беларускай навукі аб дзяржаве і праве [7, с. 52-54 ]

Узнікае пытанне: ці мог Ф. Скарына пры такіх прагрэсіўных поглядах выступаць як знаўца права, чые ідэі ўплываюць на палітычны стан дзяржавы, не маючы спецыяльнай юрыдычнай адукацыі?

Францыск Скарына – першы ў беларускай гісторыі двойчы доктар навук. Меў некалькі навуковых ступеняў: доктар навук вольных (Кракаўскі ўніверсітэт, Каралеўства Польскае) і доктар медыцыны (Падуанскі ўніверсітэт, Італія). На наяўнасць гэтых вучоных ступеняў у Скарыны паказваюць дакументы Падуанскага ўніверсітэта, а таксама каралеўскія, вялікакняскія і епіскапскія граматы. Калі абапірацца на звесткі, прадастаўленыя знакамітым гісторыкам права Белдзяржуніверсітэта, прафесарам Язэпам Аляксандравічам Юхо, Скарына таксама меў ступень доктара права [5, с. 5]. Але гэта ніяк не пацвярджаецца дакументальна. Мяркуем, калі б Скарына ўсё ж-такі меў яшчэ і такую навуковую ступень, ён, па-за ўсялякіх сумневаў, не стаў бы яе хаваць і прад'явіў бы адпаведныя дакументы ў Падуі, але такіх дакументаў няма, ці яны не захаваліся, а інфармацыя была страчана.

Пры гэтым таксама нічога не вядома адносна таго, ці вывучаў Скарына права і ці навучаўся на юрыдычным факультэце якога-небудзь еўрапейскага ўніверсітэта. Ставіць знак роўнасці паміж паняццямі «доктар навук вольных» і «доктар права», на наш погляд, не зусім карэктна. Бо беларускаму паняццю «навукі вольныя» на рускай мове адпавядае паняцце «семь свободных искусств». У тагачасны курс «вольных навук» уваходзілі наступныя прадметы: граматыка, логіка, рыторыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка. У сярэднявечных універсітэтах «навукі вольны» складалі першую прыступку

вышэйшай адукацыі і выкладаліся на ніжэйшым, падрыхтоўчым факультэце – факультэце свабодных («вольных») навук. На гэтым факультэце выкладалі таксама філасофію і некаторыя іншыя навукі. Як відаць з вышэйпададзенай інфармацыі, аб праве і юрыдычнай адукацыі нічога не сказана і дакументальна не падцверджана, таму не зусім зразумела, чаму Ф. Скарыну лічылі доктарам права.

З другога боку, Скарына, хоць і ўскосна, усё ж прымаў удзел ў стварэнні Першага Статута ВКЛ 1529 г., але не як знаўца права, а ў якасці сакратара віленскага біскупа Яна, пазашлюбнага сына караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога [3, ,с.60-67]. Ці быў Францыск Скарына спецыяльна запрошаны біскупам Янам, ці ён пазней звярнуў увагу на інтэлектуала з Полацка з двума доктарскімі ступенямі – гэта таксама невядома. Дакладна вядома толькі тое, што Скарына працаваў у біскупа Яна ў якасці сакратара.

Як мяркуецца, Скарына быў задзейнічаны ў стварэнні Статута ВКЛ як друкар і рэдактар тэкста. Бо вядома, што ўрад ВКЛ разглядаў пытанне аб выпуску Статута 1529 г. друкарскім спосабам. У прыватнасці, гэтую тэму неаднаразова ўздымалі на сеймах (у 1544 г. ў Брэсце, у 1547 і 1551 гг. у Вільні). Дакументальна пацверджана, што ўжо ў 1535 г. Францыск Скарына назаўжды пакінуў ВКЛ і трывала асеў у Празе. Такім чынам, ён не быў задзейнічаны ў выданні Статута 1529 года і як друкар, – нягледзячы на імклівае развіццё кнігадрукавання ў той час, гэты асноўны прававы дакумент ВКЛ ў XVI ст. не друкаваўся, а перапісваўся ад рукі.

Прафесар права БДУ Я. Юхо, які назваў Скарыну доктарам права, прааналізаваў толькі адну яго працу, —каментарыі доктара Францыска Скарыны з Полацка да кнігі «Другі закон Майсея» на старабеларускай мове, дзе аўтар даваў каментары, набліжаныя да палітычных і прававых ідэяў, якія пазней замацаваліся ў Статуце 1529 г.

Па аб’ёме гэты каментар Скарыны займае каля чатырох друкаваных старонак стандартнага кніжнага фармату. Мяркуючы па ўсім, ніякія іншыя прадмовы і пасляслоўі да Бібліі, зробленыя Скарынам, Язэп Юхо не аналізаваў. Прынамсі, ў трох надрукаваных працах Язэпа Аляксандравіча спасылкі на іншыя работы Францыска Скарыны адсутнічаюць. Няма ў іх і параўнальных табліц, у якіх бы прававыя ідэі Скарыны ілюстраваліся б на прыкладах з тэксту Статута 1529 г.

З усяго вышэйпералічанага можна зрабіць выснову, што доказнай базы, якая б магла пацвердзіць статус «доктара права» Ф. Скарыны адсутнічае. Я.А. Юхо, даследаваўшы гэтае пытанне і назваўшы Скарыну юрыстам, не даказаў наяўнай юрыдычнай адукацыі асветніка, а таксама прааналізаваўшы толькі яго каментары і зрабіўшы з гэтага некарэктную выснову, заблытаў даследчыкаў аб наяўнай яшчэ адной адукацыі ў Скарыны.

Безумоўна, Ф. Скарына з’яўляўся высокаадукаваным і таленавітым мысляром, першадрукаром і выбітным дзеячам культуры ВКЛ, што пацверджана дакументальна, таксама прымаў удзел у стварэнні Статута ВКЛ, але не як юрыст,

або першадрукар, а як звычайны сакратар біскупа. Дадзенае пытанне аб наяўнай юрыдычнай адукацыі застаецца адкрытым і патрабуе далейшага яго вывучэння, паколькі інфармацыі захавалася мала і дакументаў, якія пацвердзілі б яго статус, не засталося. Маем выказаць здагадку, што Ф. Скарына не з'яўляўся юрыстам і не меў спецыяльнай юрыдычнай адукацыі, а проста быў чалавекам, які атрымаў добрую еўрапейскую адукацыю і выступаў ад імя народа ў распрацоўцы прагрэсіўнага заканадаўства ў сваёй краіне, якую ён вельмі аддана любіў. Скарына адыграў важную ролю ў фарміраванні самасвядомасці беларусаў [6]. Такім чынам, палітыка-прававыя ідэі Ф. Скарыны адлюстроўвалі светапоглядныя ўстаноўкі свайго часу і адначасова падкрэслівалі самабытнасць і своеасаблівасць самога мысляра.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Алексютовіч, М. А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд / М. А. Алексютовіч. – Мінск: Выдавецтва АН БССР, 1958 [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikisource.org/wiki/%D0%. – Дата доступу: 20.01.2023
2. Белорусские мыслители XVI–XVII вв. Избранные труды. – Минск: Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2017. – 320 с.
3. Гячяускас, Э. Франциск Скорина – секретарь вильнюсского епископа Иоанна из князей литовских / Э. Гячяускас // Федоровские чтения. – 1982. – М., 1987. – С. 60–67.
4. Матарас, В. Н. Политико-правовые идеи Франциска Скорины // Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года – падмурак развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыяналізму: (да 480-годдзя прыняцця) : зб. навук. арт / Беларус. дзярж. ун-т ; рэд. Н. В. Баярава. Мінск, 2009. С. 61–64.
5. Памяць і слава: Юхо Іосіф Аляксандравіч. Да 90-годдзя са дня нараджэння / рэдкал. : С. А. Балашэнка [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2011. – 175 с.
6. Польшча разам з Літвой і Чэхіяй ушаноўвае памяць выдатнага беларускага гуманіста Францыска Скарыны [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://www.gov.pl/web/bielarus/Poland-together-with-Lithuania-and-he-Czech-Republic-commemorates-the-outstanding-Belarusian-humanist. – Дата доступу: 25.01.2023
7. Юхо, Я. Скарына і прававая культура Беларусі / Я. Юхо // Спадчына. – 1989. – № 2. – С. 52–54.